Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КРАСАВІКА 2018 г. СЕРАДА № 64 (28680)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Колькі жылля пабудуюць у 2018-м

СТАР. 4



Чаму ад адзёру няма лекаў?

СТАР. 8



Сакрэты роспісу велікодных яек

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У Беларусі распрацоўваюцца восем праектаў жылых дамоў, у якіх будзе выкарыстоўвацца электрычная энергія ў якасці цеплакрыніц. Гэта першыя крокі, думаю, што ў далейшым такое выкарыстанне электрычнай энергіі будзе набіраць тэмпы. Адпаведна, збалансуем у краіне выпрацоўку і спажыванне энергетычнага рэсурсу. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу па максімальным выкарыстанні электрычнай энергіі. Рухаемся паслядоўна ў гэтым кірунку. Выкарыстанне электрычнай энергіі для мэт ацяплення з'яўляецца дадатковым рэсурсам для энергаэфектыўнасці і зберажэння. Мяркуецца фарміраванне адпаведнай тарыфнай палітыкі».*

ISSN 1990 - 763X

# Жыццё пражыць — не лыжку выстругаць!



**Былы механік Афанасій КОНДРЫКАЎ усё жыццё працаваў у сельскай гаспадарцы, кіраваў аўтатрактарным паркам калгаса. Амаль чвэрць стагоддзя Афанасій Фядосавіч на пенсіі, яму ідзе 84-ы год. Але сядзець без справы дзядуля не можа — не ўмее! Жыхар Івянца адрадзіў на Валожыншчыне забытае рамяство — лыжкарства. На падворку, у старой адрыне, прыстасаваной пад майстэрню, ён стругае драўляныя лыжкі і каўшы, кухонныя наборы. Майстар весела прыгадвае: «Спачатку я рабіў адну лыжку за тры дні, а цяпер за дзень раблю ажно тры лыжкі!».**

**На гэтым здымку Афанасій Фядосавіч дэманструе працу сваёй жонцы Галіне Баляславаўне — яны жывуць у пары ўжо 56 гадоў.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Сацыяльны ракурс

**Ігар КАРПЕНКА:**

## «НА ПАРАДКУ ДНЯ — ЗАРОБКІ ПЕДАГОГАЎ»,

### а закрываць і аптымізаваць установы адукацыі можна толькі са згоды міністра

**З 1 верасня заробкі ў сістэме адукацыі могуць узрасці. У сістэме дашкольнай адукацыі павышэнне заработнай платы павінны адчуць у найбольшай ступені. Пра гэта паведаміў на VII Пленуме Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.**

### Сігналы SOS пачулі?

— Мы ўжо ўнеслі свае прапановы — падняць з 1 верасня аклады педагагічным работнікам і памочнікам выхавальнікаў ва ўстановах дашкольнай адукацыі на 50 працэнтаў. А педагагічным работнікам іншых устаноў адукацыі, акрамя прафесарска-выкладчыцкага складу, — на 20 працэнтаў. Падкрэслю, што гэта пакуль толькі нашы прапановы, але разам з урадам і Міністэрствам фінансаў мы зараз сур'ёзна над імі працуем, пралічваем з улікам сродкаў, што вызваліліся ў выніку праведзенай у краіне аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, — растлумачыў міністр. — Я ўпэўнены, што колькі б наш педагагічны ўніверсітэт ні павялічваў набор на факультэт дашкольнай адукацыі, кадравае пытанне ў дзіцячых садках мы не закрыем. І колькі б ні адпраўлялі работнікаў дашкольных устаноў без профільнай дашкольнай адукацыі на перападрыхтоўку, кардынальна праблему ўсё роўна не вырашым. А вось калі мы павысім заробкі, то адток з сістэмы дашкольнай адукацыі, спадзяюся, удасца спыніць. Больш таго, у дашкольную адукацыю могуць вярнуцца спецыялісты, якія адтуль пайшлі раней.

СТАР. 5

■ Спецыяльны рэпартаж

## СУЧАСНАЯ «СЫРОВАТКА ПРАЎДЫ»

### Паліграф: праверана на сабе



**У мінулым годзе расійскае тэлебачанне ўзарваў новы фармат шоу. На першым канале пачалі паказваць праграму, у якой удзельнікаў правяралі на дэтэктары хлусні. Ход, які вылучае «На самай справе» з шэрагу іншых ток-шоу, дзе на працягу гадзіны толькі і чуеш «Я вас не перапыняў, вось і вы мяне не перапыняйце», адразу ж зрабіў яго мегапапулярным. Нароўні з абмеркаваннем гісторый герояў гледачы не менш заўзята спрачаліся: праўда ці выдумка сама тэхналогія. Бо пра магчымасць пазнаваць няўхільную праўду людзі марылі стагоддзямі, прыпісваючы «чароўныя» ўласцівасці розным раслінам і зёлкам. А вы верыце ў сілу паліграфа? Мы з адказам вызначыліся, бо змаглі праверыць гэты дзіўны прыбор на сабе.**

СТАР. 12

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА — БІЗНЕС, А НЕ САЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ

**Калі паглядзець на структуру ВУП Беларусі, то ў 2016 годзе амаль 7 % у ёй займалі сельская, лясная, рыбалоўная гаспадаркі. Для параўнання: будаўніцтва — 5,7 %, транспартная сфера — столькі ж, фінансавая і страхавая дзейнасці — 4,1 %. Сельская гаспадарка хоць і саступае па ўдзельнай вазе прамысловасці, гандлю, падаткам, але традыцыйна займае значную долю. Да таго ж поспех гэтай сферы — пытанне не толькі эканамічнае, але і сацыяльнае, і палітычнае. Харчовая бяспека — адзін з аспектаў незалежнасці краіны. Пра тое, якія праблемы існуюць у сферы сельскай гаспадаркі, ішла размова на рэспубліканскім семінары-нарадзе «Аб развіцці сяла і павышэнні эфектыўнасці аграрнай галіны Рэспублікі Беларусь» з удзелам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі.**

## Стварацъ арыгінальную прадукцыю

Экспарт беларускай сельскагаспадарчай прадукцыі вырас летась у параўнанні з пазалеташнім на 16 % і дасягнуў амаль пяці мільярдаў долараў, адзначыў кіраўнік дзяржавы. Але зараз важна ствараць не столькі якасную, але традыцыйную прадукцыю, колькі арыгінальную. Напрыклад, 2 красавіка ў першым чытанні ў Палаце прадстаўнікоў быў прыняты законапраект «Аб арганічнай прадукцыі». Прэзідэнт ухваліў своечасовасць заканадаўчых змен. Людзі гатовы плаціць даражэй за якасныя, экалагічна чыстыя прадукты.

Аграрыі цяпер працуюць ва ўмовах больш жорсткай канкурэнцыі, зменлівых цэн і разнастайных бар'ераў. «Таму МЗС і Мінсельгасхарч павінны працаваць у найбольш цеснай звязцы, вырашаць агульную задачу», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Але некаторыя гаспадаркі не могуць справіцца нават з мінімальнымі задачамі — працаваць без страт. Разабрацца з непрыбытковымі сельгасарганізацыямі было даручана старшыням райвыканкамаў. Па словах кіраўніка дзяржавы, такіх прадпрыемстваў у кожным раёне не больш за чатыры. Таму ўзяць іх пад кантроль кожнаму старшыні і вывесці на бясстратны ўзровень рэальна. «Усім ужо даўно пара прызвычаіцца да думкі, што сельскагаспадарчае прадпрыемства — гэта бізнес, а не сацыяльны праект. Крыніцы росту ў аграрнай сферы павінны быць выключна ў павышэнні эфектыўнасці выкарыстання прыродных, матэрыяльных, фінансавых і працоўных рэсурсаў», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым дзяржаўная падтрымка будзе і надалей накіроўвацца на некамерцыйныя сектары АПК. Што да камерцыйных праектаў, то тут будуць падтрымлівацца тыя, чыя акупнасць — не больш за 5—7 гадоў.

## Без кадравай чахарды

Калі не ўсё, то значную колькасць праблем вырашаюць кадры. Але адкуль ім узяцца, калі, па словах Аляксандра Лукашэнкі, студэнты аграрных спецыяльнасцяў не да канца разумеюць, якую прафесію абралі і якую работу ім надалей давядзецца выконваць. «Часта мы рыхтуем спецыялістаў, у якіх няма ніякага жадання працаваць на сяле. Такі выпускнік праз два гады прынясе не столькі карысна, колькі шкоднага для гаспадаркі і сыдзе ў іншыя структуры», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што раней даручаў ствараць у найлепшых гаспадарках кожнай вобласці так званыя школы, якія б бралі будучых спецыялістаў пад крыло і паказвалі, як варта працаваць. Такім чынам студэнты змаглі б разумець, на што ім арыентавацца ў прафесіянальным плане. Таксама ёсць пытанне і да вытворцаў, якія мусяць быць зацікаўлены ў тым, каб да іх пасля ВНУ прыходзілі кваліфікаваныя спецыялісты.

Што датычыцца сталых кадраў, то тут часта замест таго, каб дапамагчы разабрацца з прычынамі, якія перашкаджаюць развіццю гаспадаркі, проста замяняецца яе кіраўнік ці спецыялісты. Летась здарылася 273 такія выпадкі. Напрыклад, у Гомельскай вобласці замянілі кожнага трэцяга кіраўніка. Выхад тут — павышаць прэстыж працы на сяле і ўдасканальваць яе аплату. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў своечасовай аплаты працы работнікаў сяла і яе павышэння. Але грошы мусяць быць заробленымі, падкрэсліў Прэзідэнт.

Яшчэ адно балючае пытанне — як падцягнуць узровень жыцця ў вёсках да гарадскога. Прэзідэнт даручыў ураду разам з рэгіёнамі выпрацаваць механізм рэалізацыі канцэпцыі «вёскі будучыні» з улікам рэгіянальных асаблівасцяў. Пры гэтым варта падысці да гэтага комплексна, у тым ліку перагледзець эфектыўнасць выкарыстання пустуючага жытла ў малых вёсках і на хутарах. «У кожным раённым цэнтры, аграгарадку, вёсцы павінны быць добрыя дарогі, якасная вада, сацыяльнае абслугоўванне, забяспечанасць неабходнымі таварамі, а таксама інтэрнэтам, пажадана высокахуткасным», — абазначыў кіраўнік дзяржавы.

## Павялічыць пагалоўе

У жывёлагадоўлі асаблівая роля — малочнаму кірунку. «У шэрагу сельскагаспадарчых арганізацый надой у сярэднім больш за 10 тон малака, — сказаў кіраўнік дзяржавы пра гадавы паказчык. — Але ёсць і адваротныя прыклады, калі ў асобных гаспадарках летась не выйшлі нават на 1 тысячу 800 кілаграмаў». Колькасць нарыхтаваных кармоў расце, а паляпшэння прадукцыйнасці малочнага статка не назіраецца. Верагодна, абраная сіласна-канцэнтратная сістэма не самым лепшым чынам адпавядае фізіялагічным патрэбам жывёл. «Трэба тэрмінова выпраўляць становішча!» — паставіў задачу Прэзідэнт.

Не ўсе пабудаваныя па праграме малочнатаварныя комплексы паказваюць добрыя вынікі па ўдоях. Хоць ёсць і такія, што ў неспрыяльных прыродных умовах паказваюць амаль рэкордныя вынікі. Але мала пабудаваць добры будынак і паставіць найлепшае абсталяванне, трэба яшчэ ўкамплектаваць фермы высакаякасным статкам, паўнавартасна і танна накарміць жывёл і захаваць іх здароўе. «Трэба павялічыць пагалоўе буйной рагатай жывёлы зыходзячы з крытэрыю: адна галава на адзін гектар сельскагаспадарчых угоддзяў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — На жаль, у гаспадарках пагалоўе кароў павялічваецца нізкімі тэмпамі».

У любым выпадку аснова эканамічнага поспеху ў гаспадарках — новыя тэхналогіі. «Кажуце, што патрэбна дыктатура тэхналогій? Яна будзе. У форме заканадаўчага акта. І такі заканадаўчы акт ураду трэба падрыхтаваць. І прадугледзець адказнасць за рэалізацыю кожнага яго палажэння», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

## За ўсё будзе спагнана

«Я патрабую ад Камітэта дзяржаўнага кантролю, МУС і пракурора: правядзіце кантрольныя праверкі (у сферы АПК. — **Аўт.**) не адкладаючы. І самым жорсткім чынам, — загадаў Аляксандр Лукашэнка і даручыў далажыць асабіста, як гэта даручэнне будзе выканана. — Правядзіце кантрольныя праверкі і вярніце ўсіх да прытомнасці».

Таксама Прэзідэнт паставіў задачу да 15 красавіка ўсю сельскагаспадарчую тэхніку прывесці да ладу і гатоўнасці. Асаблівая ўвага была ўдзелена зарплаце работнікаў сельскай гаспадаркі. Ёсць пытанні і па крадзяжах, асабліва што датычыцца паліва. «Крадзяжы паліва становяцца адной з галоўных крыніц прыбытку для кіроўцаў аўтамабіляў і сельскагаспадарчай тэхнікі. Але гэта датычыцца не толькі гаручага, але і ўсіх тэварна-матэрыяльных каштоўнасцяў», — сказаў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што гэту праблему трэба вырашаць неадкладна.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Тры пытанні да ўлады

# ДЗЕ ЧАКАЮЦЬ ФЕРМЕРАЎ?

### Кіраўніцтва Драгічынскага раёна — пра новыя садкі і працоўныя месцы ў вёсцы



**У Год малой радзімы ў цэнтры ўвагі аказаліся невялікія населеныя пункты. Пра тое, што робіцца, каб стварыць камфортныя ўмовы ў вёсках і гарадах, каб людзі захацелі там застацца, расказаў старшыня Драгічынскага райвыканкама Аляксандр ДАРАШЭНКА.**

**— Якія мерапрыемствы (напрыклад, па навядзенні парадку на зямлі) чакаюцца ў Год малой радзімы ў вашым раёне?**

— З 12 сакавіка па 28 красавіка ў нас праводзіцца месячнік па добраўпарадкаванні і азеляненні ў населеных пунктах раёна. Будзе арганізавана работа з насельніцтвам па падтрыманні чысціні і парадку ў дварах шматкватэрных дамоў, індывідуальных домаўладанняў у гарадской і сельскай мясцовасці. Плануецца прывесці ў належны санітарны стан адміністрацыйныя тэрыторыі, ліквідаваць несанкцыянаваныя звалкі, падрыхтаваць вулічна-дарожную сетку да эксплуатацыі ў летні перыяд і многае іншае.

30 сакавіка ў раёне будзе праводзіцца маладзёжная экалагічная акцыя «Чысты лес», у рамках якой прыбяруць паркі, лесапалосы, набярэжныя вадаёмаў, воінскія пахаванні і помнікі. У акцыі паўдзельнічае таксама дэпутацкі корпус.

У Год малой радзімы будзе падрыхтавана праектна-каштарысная дакументацыя па будаўніцтве новых ачышчальных збудаванняў Драгічына. А ў рэгіёне пачнём рэалізоўваць сумесны польска-беларуска-ўкраінскі праект «Буг аб'ядноўвае нас» па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва па стварэнні двух трансгранічных байдарачных маршрутаў. Падчас праекта добраўпарадкуем таксама тэрыторыю Дняпроўска-Бугскага канала і абсталюем месцы стаянак.

**— Каб людзі засталіся на малой радзіме, для гэтага павінны быць створаны спрыяльныя ўмовы. Ці хапае ў раёне сацыяльных аб'ектаў?**

— Сёлета будзе праектавацца пяціпавярховы жылы дом з убудаваным дзіцячым садком на 60 месцаў у паўднёва-заходняй частцы Драгічына. У Немяржанскай сярэдняй школе плануецца адкрыць рознаўзроставую групу для дашкольнікаў і зрабіць рамонт. А каб замацаваць маладых спецыялістаў у Драгічыне, у шматкватэрным доме, які цяпер узводзіцца, збіраемся выдзеліць 10 жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання.

**— Згодна з новым Дэкрэтам № 1, пытанні працаўладкавання насельніцтва ў кожным рэгіёне будуць вырашацца з улікам яго індывідуальных асаблівасцяў. Як у Драгічынскім раёне плануюць садзейнічаць занятасці насельніцтва? Ці накладае адбітак тое, што рэгіён — сельскагаспадарчы?**

— Сёлета на вёсцы плануецца стварыць 37 новых працоўных месцаў: 34 — у прамысловасці, тры — у сельскай гаспадарцы.

Працягваем выдзяляць грамадзянам зямельныя ўчасткі з земель запасу для заняцця фермерскай дзейнасцю. Вясной фермерскімі гаспадаркамі раёна па дагаворы падраду будуць прыняты на работы да паўтары да дзвюх тысяч чалавек.

У планах арганізаваць аплатныя грамадскія работы па экалагічным аздараўленні тэрыторыі ў 10 сельскіх выканаўчых камітэтах.

У чэрвені-ліпені збіраемся ўладкаваць 55 чалавек сельскай моладзі ў рамках часовай занятасці на базе абласнога аграрна-вытворчага прафесійнага ліцэя, Брашэвіцкай і Бездзежскай сярэдніх школ.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Афіцыйна

# БЛІЗКІ УСХОД

**На гэтым тыдні Беларусь з рабочым візітам наведвае міністр па справах палаца Прэзідэнта Сірыйскай Арабскай Рэспублікі Мансур Азам.**

Як паведаміла БЕЛТА, на днях з ім правяла сустрэчу кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава. «Я ўпэўнена, што ў гэты візіт вы лепш даведаецеся пра Беларусь, яе гісторыю, культуру. Думаю, вам будзе цікава даведацца, як выбудаваная вертыкаль улады ў нашай краіне», — адзначыла яна.

Па словах Наталлі Качанавай, Беларусь і Сірыя валодаюць вялікім патэнцыялам для нарошчвання двухбаковага супрацоўніцтва і выхаду на больш высокі ўзровень. Нагадаем, зносіны дзяржаў актывізаваліся з 2015 года.

Дарэчы, гэта не першае наведванне Мансура Азама беларускай сталіцы — у 2010 годзе ён суправаджаў Прэзідэнта Сірыі Башара Асада падчас афіцыйнага візіту ў нашу краіну.

Сірыйскі чыноўнік таксама наведаў Міністэрства адукацыі Беларусі і сустрэўся з міністрам адукацыі Ігарам Карпенкам. Як расказаў міністр, у мэтах актуалізацыі двухбаковага ўзаемадзеяння Міністэрства адукацыі Беларусі распрацавала праект пагаднення паміж урадамі краін аб супрацоўніцтве ў сферы вышэйшай адукацыі. Падпісанне дакумента дазволіць павялічыць колькасць навукова-даследчых праектаў, пашырыць абмен студэнтамі і выкладчыкамі, навучанне сірыйцаў у беларускіх установах.

Акрамя таго, беларускі бок прапанаваў даць на дагаворнай аснове магчымасць прафесійнай адукацыі для сірыйскіх грамадзян па розных спецыяльнасцях, а таксама дапамогу ў стварэнні на тэрыторыі Сірыі цэнтраў прафесійна-тэхнічнай падрыхтоўкі.

Яшчэ на сустрэчы абмеркавалі работу з адоранымі вучнямі, новыя аспекты ў маладзёжнай палітыцы, а таксама аздараўленне сірыйскіх дзяцей у Беларусі — плануецца, што сёлета нашу краіну наведаюць да 500 хлопчыкаў і дзяўчынак з Сірыі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Тарыфы

# Заказная карэспандэнцыя — па новых цэнах

### Падаражэлі некаторыя паслугі паштовай сувязі

У прыватнасці, зменяцца тарыфы на асобныя нерэгулюемыя ўнутрырэспубліканскія паслугі паштовай сувязі агульнага карыстання. Маюцца на ўвазе перасылка простых дробных пакетаў, адпраўленняў 1-га класа, заказной пісьмовай карэспандэнцыі, карэспандэнцыі з абвешчанай каштоўнасцю, пасылак. Павышэнне тарыфаў на паслугі складзе ў сярэднім 6 % да ўзроўню тарыфаў, якія дзейнічалі раней.

Разам з тым нязменнымі застануцца тарыфы на перасылку ўнутрырэспубліканскіх адпраўленняў EMS, паштовых грашовых пераводаў, паслуг «Паштовы кур'ер», «Прамая паштовая рэклама», «Паштовы маркетынг», «Мясцовая пасылка», «Экспрэс-кур'ер». Усе змяненні будуць актуалізаваны ў раздзеле «Тарыфы» на сайце «Белпошты».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ На парадку дня

# БЕЗЛІЧ ПАРУШЭННЯЎ

## выявілі ў гандлёвых цэнтрах

**На мінулым тыдні ратавальнікі па ўсёй краіне правяралі работу сістэм эвакуацыі ў аб'ектах, куды масава прыходзяць людзі — гасцініцах, гандлёвых цэнтрах, кінатэатрах... Нагадаем, праверкі пачаліся па даручэнні Прэзідэнта пасля трагедыі ў Кемераве. І вось у суботу Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прадставіла інтэрактыўную карту. На ёй пазначаны 334 аб'екты, на якіх з пажарнай бяспекай было не ўсё добра.**

Напрыклад, у гандлёвым цэнтры, што знаходзіцца ў Оршы, быў выяўлены проста «букет» парушэнняў. Усе планы эвакуацыі не адпавядаюць нормам. З памяшкання для фітнесу, размешчанага на чацвёртым паверсе, на шляхах эвакуацыі усталяваны шкляныя дзверы. Вогнетушыцель і план эвакуацыі закідалі таварамі. А дзе-нідзе чырвоных агрэгатаў проста не было, нягледзячы на тое, што месцы для іх былі пазначаны. Праектнай дакументацыі, якая магла б пацвердзіць законнасць перапланіроўкі, таксама не знайшлося.

У краме па продажы канцылярскіх тавараў запасны выхад быў застаўлены металічнымі стэлажамі, з аднаго вогнетушыцеля была сарвана пломба, а на другім наогул не было раструба. Чым тушыць пажар і куды бегчы — пытанні добрыя. У іншай фірменнай краме вогнетушыцель знайшоўся, але ў ім не было ціску. На шляхах эвакуацыі на першым паверсе і ўвогуле стаяў стол, дзе прадавалі латарэйныя білеты.

Адкрываем спіс парушэнняў у гандлёвым цэнтры ў Светлагорску. Планы эвакуацыі намаляваны без уліку перапланіроўкі. Цікава, што магло б аказацца на шляху людзей — сцяна, зачыненыя дзверы, тупік? Дзверы некаторых эвакуацыйных выхадаў зачыняліся на замкі, якія знутры без ключа адмыкнуць немагчыма. Вось вам і гатовая пастка. У некалькіх вогнетушыцеляў закончыўся тэрмін прыдатнасці. Рукаў унутранага пажарнага крана меў разрывы. У памяшканні станцыі пажаратушэння інспектары знайшлі... старыя аконныя рамы.

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка прапаноўвае працягнуць праверкі аб'ектаў, дзе масава знаходзяцца людзі. Адпаведная запіска ўжо падрыхтавана кіраўніку дзяржавы.**

Але самая «фішка» чакала іх на запасным эвакуацыйным выхадзе з цокальнага паверха. На ім красаваўся аптымістычны надпіс «Выхада няма». Ну і па традыцыі, дзверы былі зачынены на замок, які без ключа адмыкнуць немагчыма. Пры запуску сістэмы апавяшчэння людзей аб пажары адначасова гучалі музыка і рэкламныя аб'явы.

З дыманепранікальных дзвярэй былі зняты даводчыкі — а гэта значыць, што яны маглі фіксавацца і ў адчыненым стане. А з запаснога эвакуацыйнага выхада на трэцім паверсе, які вёў на дах, кудысьці трапіць было немагчыма, паколькі была прыбрана лесвіца.

Пералічваць усе парушэнні можна бясконца доўга. Вось толькі чым кіраваліся ўласнікі і арандатары памяшканняў, не сочачы за станам бяспекі? Жаданнем зарабіць нягледзячы ні на што? Ці думкай, што ў іх ніколі не адбудзецца пажару?

— Мусім адзначыць, што большасць выяўленых парушэнняў носяць рэжымны характар, — паведаміў «Звяздзе» **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Каб іх ліквідаваць, не трэба выдаткоўваць фінансавыя сродкі. Таму кіраўнікі цэнтраў, магазінаў часта прыводзілі свае памяшканні ў бяспечны стан адразу ў прысутнасці інспектара. Па выяўленых парушэннях распачаты адміністрацыйны працэс: больш за 300 кіраўнікоў ужо прыцягнутыя да адказнасці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

❍ ТЫМ ЧАСАМ

### Без кантролю

**Сталі вядомы вынікі праверкі, якую правёў Дзяржпрамнагляд**

— Нашы інспектары прыйшлі ў 160 устаноў, дзе эксплуатуюцца патэнцыйна небяспечныя аб'екты, — паведамілі ў ведамстве. — Гэта ліфты, эскалатары, травалатары, кацельныя, сістэмы размеркавання газу і яго спажывання. Усяго такіх аб'ектаў — 987.

Цікава, але парушэнняў інспектары выявілі нават болей — 1062. Прычым 71 з іх уплывае на бяспечную эксплуатацыю і ствараe пагрозу ўзнікнення надзвычайных сітуацый пры іх эксплуатацыі. Усе аб'екты, дзе былі выяўлены сур'ёзныя парушэнні, спынены да таго часу, пакуль не ліквідуюць няспраўнасці. Сярод тыповых парушэнняў — адсутнасць вытворчага кантролю за выкананнем патрабаванняў прамысловай бяспекі, неналежнае абслугоўванне і рамонт тэхнікі. Таксама спецыялісты Дзяржпрамнагляду канстатавалі адсутнасць эксплуатацыйнай і тэхналагічнай дакументацыі. Часам не знаходзіліся дакументы, якія пацвярджаюць правядзенне тэхнічнага абслугоўвання і бягучага рамонту. Ва ўстановах адсутнічалі спецыялісты, адказныя за бяспечную эксплуатацыю аб'ектаў. Абслуговы персанал не ведаў, што рабіць падчас надзвычайнай сітуацыі. Супрацоўнікі аховы, якія працуюць у памяшканнях, куды выведзена аварыйная сігналізацыя з кацельнай і ліфта, завальвалі іспыты па парадку дзеянняў пры паступленні сігналу.

■ На слыху

# Максімальная бяспека

## Што змянілася ў ахове правапарадку мінскага метро

**На днях беларускія СМІ ўскалыхнула навіна, што супрацоўнікі міліцыі не будуць аглядаць пасажыраў сталічнай падземкі. Мауляў — надыходзяць вялікія перамены.**

**На самай справе, ніякай сенсацыі ў інфармацыі няма. Усяго толькі заканадаўча было замацавана рашэнне, прынятае яшчэ ў пачатку года.**

8 студзеня Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб скасаванні ўпраўлення ўнутраных спраў па ахове Мінскага метрапалітэна». Гэта было зроблена з мэтай удасканалення дзейнасці міліцыі. Абавязкі падзялілі паміж сабой галоўнае ўпраўленне ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама і служба бяспекі Мінскага метрапалітэна. А пастанова Савета Міністраў ад 29 сакавіка № 234 проста замацавала гэтыя змены, а таксама іншыя дапаўненні ў Правілах перавозак пасажыраў метрапалітэнам. У цэлым, дагляндам асабістых рэчаў пасажыраў і раней займаліся толькі супрацоўнікі метрапалітэна, прадстаўнікоў праваахоўных органаў выклікалі ў выпадку, калі знаходзілі ў багажы нешта падазронае. Так што на правілах праходжання дагляду гэтыя змены ніяк не адаб'юцца.

Як растлумачыў «Звяздзе» **прэс-сакратар Мінскага метрапалітэна Андрэй ДРОБ,** у метрапалітэне робіцца ўсё магчымае, каб забяспечыць пасажырам максімальную бяспеку і зручнасць. Згодна з пастановай Савета Міністраў, адным з новаўвядзенняў стаў дазвол на правоз зброі і боеприпасаў да яе, калі маецца дакумент, які пацвярджае правa на яе нашэнне. Пры гэтым зброя абавязкова павінна быць укладзена ў чахол, кабуру або спецыяльны футляр. У першую чаргу змяненне закране тых, хто абавязаны насіць зброю па доўгу службы. Таксама змяніліся правілы правозу газавых балонаў. Раней гэта было забаронена ў прынцыпе, цяпер абмежаванне не закранае балоны аб'ёмам менш за 0,5 літра.

**Дар'я КАСКО.**

# Сок пайшоў. На экспарт таксама

**Лясгасы Брэсцкай вобласці прыступілі да нарыхтоўкі бярозавіку. Як паведаміла інжынер вытворчага аддзела Брэсцкага лясгаса Дар'я ХАЙКО, пункты нарыхтоўкі разгарнулі ўсе дзевяць лясніцтваў. Іх супрацоўнікі будуць адгружаць свежы напой арганізацыям-нарыхтоўшчыкам, а таксама прадаваць насельніцтву. Кошт бярозавага соку для тых, хто прыедзе на дзялянку, складае сёлета 16 капеек за літр.**

На сезон названаму лясгасу запланавана сабраць 450 тон напою з бяроз, гэта прыкладна на ўзроўні мінулага года. «Але ўсё будзе залежаць ад прыроды, — адзначыла Дар'я Хайко. — Летась зборам соку мы займаліся прыкладна месяц, колькі давядзецца сёлета — невядома. Цяпло можа стаць перашкодай».

У цэлым на Брэстчыне запланавана атрымаць сем тысяч тон карыснай прадукцыі, як паведамілі ў абласным лесагаспадарчым аб'яднанні. Лунінецкі, Ганцавіцкі і Івацэвіцкі лясгасы маюць намер адпраўляць сок на экспарт. Дарэчы, летась літоўцы вельмі ахвотна куплялі беларускі бярозавік.

# У Мухавец трапілі салярка з мазутам

**У старым рэчышчы ракі Мухавец на ўскраіне Жабінкі мясцовыя жыхары ўбачылі падазроныя плямы, якія вельмі нагадвалі нафтапрадукты.**

Аказалася, што гэта чарговы выкід астаткаў паліва, якое засталося пасля былой ваеннай нафтабазы. Згаданая база на плошчы 50 гектараў знаходзілася ў гэтым месцы даволі доўга. І час ад часу тут знаходзяць не толькі рэшткі вадкасці, але і цэлыя бочкі з палівам. Як было, напрыклад, у 2013 годзе, калі з дна ракі паднялі іржавую ёмістасць, з якой выцякала паліва.

Як паведамілі **намеснік начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Сяргей ШТЫК,** рэшткі паліва выплылі ў яму з грунтовымі водамі падчас раставання снегу. А з ямы ўжо пацяклі ў старое рэчышча Мухаўца. Супрацоўнікі МНС адпампавалі забруджаную ваду, рассыпалі сарбенты. Яму загарадзілі дошкамі, каб не дапусціць распаўсюджвання шкодных рэчываў. Экалагі адзначаюць, што пагрозы рацэ няма, гібель рыбы не зафіксаваная.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СМІ: НА СУСТРЭЧЫ ЛІДАРЫ КНДР І ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ МОГУЦЬ ПРЫНЯЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ ЗАБАРОНЕ ЯДЗЕРНАЙ ЗБРОІ

Дэкларацыя аб дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава можа быць прынятая на сустрэчы кіраўніка КНДР Кім Чэн Ына і прэзідэнта Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Іна, якая адбудзецца 27 красавіка ў памежным пункце Пханмунджом у дэмілітарызаванай зоне, паведаміла інфармацыйнае агенцтва Kyodo са спасылкай на словы супрацоўніка адміністрацыі прэзідэнта Паўднёвай Карэі.

«Прыняцце дэкларацыі было б натуральным крокам, — сказаў ён. — У цэнтры ўвагі на саміце будзе менавіта пытанне аб дэнуклеарызацыі».

Поўнач і Поўдзень Карэі ў 1992 годзе ўжо прымалі падобны дакумент, які абвяшчаў забарону на вытворчасць і валоданне ядзернай зброяй. Аднак КНДР пасля адмовілася ад такіх абавязацельстваў.

У той жа час на сустрэчы са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам у Пекіне ў сакавіку Кім Чэн Ын, па паведамленні кітайскага боку, выказаў гатоўнасць да паэтапнай дэнуклеарызацыі пры ўмове, што ЗША і Паўднёвая Карэя адмовяцца ад варожай палітыкі і распачнуць крокі па дасягненні міру і стабільнасці ў рэгіёне.

### ПУЦІНУ ЎРУЧЫЛІ НОВАЕ ПАСВЕДЧАННЕ ПРЭЗІДЭНТА ТЭРМІНАМ ДЗЕЯННЯ ШЭСЦЬ ГАДОЎ



Кіраўнік Цэнтрвыбаркама Расійскай Федэрацыі Эла Памфілава на сустрэчы ў Крамлі ўручыла прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну пасведчанне кіраўніка дзяржавы на новы тэрмін паўнамоцтваў. Яна таксама расказала, што па празрыстасці і чысціні мінулым выбарам не было аналагаў у свеце.

Згодна з законам, абраны прэзідэнт заступае на пасаду пасля заканчэння шасці гадоў з дня ўступлення на пасаду кіраўніка дзяржавы, абранага на папярэдніх выбарах. У 2012 годзе інаўгурацыя Пуціна адбылася 7 мая.

У гутарцы з Пуціным Памфілава таксама адзначыла, што ў ЦВК выкарысталі шматслаёвую сістэму фільтраў для прадухілення ўсякага роду парушэнняў і выбары прайшлі беспрэцэдэнтна адкрыта.

### ТРАМП З ЖОНКАЙ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ У ВЕЛІКОДНЫМ ДЗІЦЯЧЫМ СВЯЦЕ НА ЛУЖКУ КАЛЯ БЕЛАГА ДОМА

Каля 30 тысяч дзяцей і дарослых з усёй краіны атрымалі запрашэнні па выніках праведзенай у лютым адкрытай латарэі ад прэзідэнта ЗША Дональда Трампа і яго жонкі Мелані наведаць іх рэзідэнцыю, каб прыняць удзел у традыцыйных велікодных урачыстасцях. Мерапрыемствы ўключаюць музычныя выступленні, карнавальныя і цыркавыя нумары, спартыўныя гульні, чытанне кніг, гатаванне страў і галоўную забаву для дзяцей — катанне па траве рознакаляровых велікодных яек. Гэтая традыцыя зарадзілася 140 гадоў таму — у 1878 годзе пры 19-м прэзідэнце краіны Ратэрфордзе Хейсе, які вырашыў штогод на другі дзень Вялікадня ладзіць перад Белым домам святочныя гулянні. Перад пачаткам мерапрыемства Трамп і Мелані выйшлі на балкон сваёй рэзідэнцыі і павіталі гасцей. Выступаючы перад прысутнымі, прэзідэнт падзякаваў жонцы за арганізацыю свята. Трамп адзначыў, што Мелані «прарабіла неверагодную працу» пры падтрымцы Гістарычнай асацыяцыі Белага дома, Нацыянальнай паркавай службы ЗША, а таксама тысяч валанцёраў, якія дапамагалі ёй.

Тым часам стала вядома, што колькасць амерыканцаў, якія ўхваляюць дзейнасць Дональда Трампа на пасадзе прэзідэнта ЗША, дасягнула 50 %. Пра гэта сведчаць апошнія вынікі апытання даследчай службы Rasmussen. Як адзначае Rasmussen, узровень падтрымкі Трампа «цяпер вышэйшы, чым той, што быў у Барака Абамы на аналагічным этапе знаходжання ў Белым доме».

■ Будаўніцтва

# ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ — АСОБНАЯ ЧАРГА

## Сёлета плануецца ўзвесці 4 млн квадратных метраў жылля

**Год у будаўнікоў пачынаўся цяжка. Без задзелаў, з нуля. Але наяўная дынаміка паказвае, што тэмпы будуць нарастаць. За першыя тры месяцы года агульны ўвод жылля ў краіне складае каля 860 тысяч квадратных метраў, з іх з дзяржаўнай падтрымкай — каля 200 тысяч «квадратаў», паведаміў журналістам начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

### «КВАДРАТ» НЕ ДАРАЖЭЙ ЗА 923 РУБЛІ

Складзены пералікі аб'ектаў, якія будуць уводзіцца ў гэтым годзе. «Ёсць упэўненасць, што запланаваныя на бягучы год 4 млн квадратных метраў жылля будуць пабудаваны, хоць гэта і не так проста. А вось 900 тысяч квадратных метраў з дзяржпадтрымкай — строга абавязковы для выканання параметр», — падкрэсліў Аляксандр Горваль.

**Неабходна шукаць варыянты яшчэ больш актыўнага стымулявання нараджальнасці. Ёсць кампенсацыі па крэдытах на будаўніцтва жылля пры нараджэнні дзяцей. Але, напэўна, трэба павялічыць аб'ём.**

Сярэдні кошт квадратнага метра жылля па краіне вырасці па краіне яшчэ не атрымалася. Гэты паказчык па горадзе Мінску роўны 864 рублі. «У мінулым годзе мы давядзены кошт квадратнага метра жылля з дзяржпадтрымкай вытрымалі, уклаліся ў меншую суму, чым была вызначаная. Да канца года максімальны кошт не павінен перавысіць 923 рублі за квадратны метр», — адзначыў Аляксандр Горваль. Паводле яго слоў, гэта значна менш за камерцыйнае будаўніцтва, дзе кошт пачынаецца ад 1900 рублёў.

**«У гарадах-спадарожніках запланавана пабудаваць 532 кватэры, з якіх у Жабінцы — 50 кватэр, у Скідзелі — 84 кватэры».**

### АПРАЎДАНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

У краіне з пачатку года заключана больш за 2,7 тысячы дагавораў на крэдытаванне будаўніцтва жылля па ўказе № 240. «Адкрыта крэдытных ліній на суму каля 140 млн рублёў, асвоена ўжо 75 млн», — удакладніў начальнік упраўлення. Паводле яго слоў, нягледзячы на тое, што сёлета запланавана павелічэнне амаль удвая аб'ёму будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай у параўнанні з 2017 годам, выкананне задання цалкам рэальнае, паколькі істотна павялічана фінансаванне. Гэтаму спрыяе Указ № 240, які дазволіў прыцягнуць у гэтым годзе 562 мільёны рублёў. Ёсць зацікаўленасць у банкаў на працягу года дадаць яшчэ сродкі.

Варта адзначыць, што ўказ аб адрасным субсідаванні ў жыллёвым будаўніцтве ўступіў у сілу ў жніўні мінулага года. Дзяржаўныя субсідыі налічваюцца на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам на будаўніцтва жылля, атрыманым грамадзянамі ў любым камерцыйным банку, а шматдзетным і маладым сем'ям і дзецям-сіротам — таксама на пагашэнне часткі асноўнага доўгу па такіх крэдытах. Атрымальнікамі субсідый могуць быць усе грамадзяне, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку ў адпаведнасці з указам № 13.

### ПАДТРЫМКУ ПАВЯЛІЧАЦЬ

Па стане на пачатак мінулага года ў чарзе было 30,5 тысячы шматдзетных сем'яў, на пачатак бягучага года — ужо 34,8 тысячы. «З аднаго боку, чарга нарастае, з другога — мы лічым, што гэта вынік стымулявання нараджэння трэцяга, чацвёртага і наступных дзяцей жыллёвымі праграмамі, якія існуюць у краіне. На гэты год запланавана пабудаваць жыллё для 7 тысяч 29 шматдзетных сем'яў. На наступны перыяд разглядаецца пытанне, каб было ад 7 да 10 тысяч», — адзначыў Аляксандр Горваль.

Таксама, на яго думку, неабходна шукаць варыянты яшчэ больш актыўнага стымулявання нараджальнасці. Ёсць кампенсацыі па крэдытах на будаўніцтва жылля пры нараджэнні дзяцей. Але, напэўна, трэба павялічыць аб'ём. Таму разглядаюцца пытанні павелічэння дзяржаўнай падтрымкі на будаўніцтва жылля пры нараджэнні дзяцей.

### АРЭНДНАЕ — СА «СКРЫПАМ»

Пытанне з будаўніцтвам арэнднага жылля застапарылася адразу па заканчэнні масавай прыватызацыі. Бо вядома, што фінансуецца гэтае мерапрыемства выключна з мясцовых бюджэтаў. Прыватызацыя скончылася — і крыніца фінансавання будаўніцтва арэнднага жылля закрылася. Цяпер аб'ёмы папаўняюцца толькі за кошт зваротных сродкаў наяўнага жылога фонду. А гэта няшмат. Таму, як і ў мінулым годзе, сёлета запланавалі будаўніцтва толькі 90 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля.

### У СПАДАРОЖНІКАХ ПАБУДУЮЦЬ 500 КВАТЭР

У гарадах-спадарожніках сёлета плануецца пабудаваць крыху больш за 500 кватэр. Мізэр, але гэтаму ёсць свае прычыны. Першая — недахоп фінансавання аб'ектаў інфраструктуры. «У гарадах-спадарожніках запланавана пабудаваць 532 кватэры, з якіх у Жабінцы — 50 кватэр, у Скідзелі — 84 кватэры. Астатняе — у гарадах-спадарожніках сталіцы. Гэта крыху больш, чым у папярэднія перыяды, аднак пакуль дынаміка недастатковая», — адзначыў Аляксандр Горваль. Паводле яго слоў, асноўная загвоздка — у фінансаванні, прычым будаўніцтва не столькі жылля, колькі сацыяльных аб'ектаў, а таксама ў арганізацыі працоўных месцаў, якія былі б супастаўныя па ўзроўні аплаты ў буйных гарадах.

**Сяргей КУРКАЧ.**

❍ У ТЭМУ

Памер субсідыі на выплату часткі працэнтаў для сем'яў з трыма непаўналетнімі дзецьмі будзе раўняцца стаўцы рэфінансавання плюс 2 %, з чатырма і больш непаўналетнімі дзецьмі — стаўцы рэфінансавання плюс 3 %, з трыма і больш дзецьмі да 23 гадоў, для дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў, — стаўцы рэфінансавання плюс 2 %. Сем'ям з чатырма і больш дзецьмі асноўны доўг будзе пагашаны на 100 %, з трыма дзецьмі ва ўзросце да 23 гадоў — на 95 %, дзецям-сіротам — на 35 %, маладым сем'ям пры нараджэнні аднаго і дваіх дзяцей — на 10 % і 20 % адпаведна.

# Пасля 25-гадовага перапынку...

## У Шчучыне будуюць сучасны дзіцячы сад, які адкрыецца для маленькіх наведвальнікаў першага верасня



Жылы масіў Заходні пачаў будавацца на ўскрайку райцэнтра ў 90-я гады. Паралельна ўзводзіліся і аб'екты інфраструктуры — крамы, аптэка, пошта. Пабудавалі і школу, а вось дзіцячага садка тут не было, хоць месца для яго па праекце адводзілася. Жыхары неаднаразова заяўлялі ўладам аб неабходнасці будаўніцтва дашкольнай установы, бо сем наяўных садкоў Шчучына перагружаны на 20 %. Але далей абяцанняў справа доўгі час не ішла.

І вось нарэшце ў мінулым годзе было прынята рашэнне — сад будаваць. І адразу замахнуліся на самы сучасны праект, які існуе ў краіне. Яго кошт складае 5,5 млн рублёў, агульная плошча крыху большая за 5 тысяч квадратных метраў. Садок шматфункцыянальны.

У кожнай групы будзе свой асобны блок, у якім размесцяцца спальня, буфет, пакой для гульні, санвузел, раздзявальня. На першым паверсе прадугледжаны харчовы і медыцынскі блокі. А яшчэ на радасць малым — басейн. Для ўмацавання здароўя будзе таксама абсталявана гімнастычная зала, для развіцця талентаў — музычная. У кожнай зале адначасова могуць займацца да 20 выхаванцаў. Для адпачынку персаналу прадугледжаны пакой псіхалагічнай разгрузкі.

— Мы не бачылі такіх садкоў, бо раней будавалі па іншых, прасцейшых праектах, — кажа **загадчыца дзіцячага садка Алена ФЕДАСЕЕВА.** — Такому падарунку рады ўсе жыхары мікрараёна, бо тут будуць створаны сапраўды цудоўныя ўмовы і для дзетак, і для работнікаў.

Аналагічны садок пабудаваны не так даўно ў Пінску. Дэлегацыя са Шчучына, у тым ліку і будаўнікі, пабывалі там, каб абмеркаваць функцыянальныя асаблівасці садка, а таксама даведацца, якія пытанні ўзнікалі падчас яго эксплуатацыі. Для сябе зрабілі некалькі высноў. У першую чаргу — звярнуць увагу на дах і харчовы блок.

— Важна зрабіць так, каб завеі не наносілі снег пад дах, і, вядома, прыняць усе меры бяспекі, — заўважыў **дырэктар будаўнічай арганізацыі Аляксандр СМІРНОЎ.** — Таксама вырашылі, што харчовы блок пашырым. Звярнулі ўвагу на каларыстыку.

Зараз на аб'екце працуе каля 80 будаўнікоў, але праз месяц іх колькасць павялічыцца. Цяпер вядуцца работы на даху, ідзе ўцяпленне фасада, выконваюцца сантэхнічныя работы. Па словах Аляксандра Смірнова, скончыць усе работы ў двухпавярховым садку павінны да першага верасня.

Новая дашкольная ўстанова разлічана на 170 месцаў. Гэта самы вялікі дзіцячы садок у Шчучыне, дзе падобныя аб'екты не будаваліся больш за 25 гадоў. Па словах Алены Федасеевай, ужо вядзецца запіс у будучы сад і колькасць ахвотных уладкаваць сюды сваіх дзяцей нават перавышае ўмяшчальнасць дашкольнай установы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

■ Грошы

## Пазыковая нагрузка не больш за 40 % ад даходу

3 першых дзён мая галоўны фінансавы рэгулятар краіны плануе скарэктаваць умовы выдачы крэдытаў насельніцтву

**Пра гэта паведаміў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый ЛАПКО. «Планы па ўвядзенні каэфіцыента пазыковай нагрузкі спецыялісты разглядалі ўжо даўно. Банкам давядзецца жыць з гэтым каэфіцыентам, ён будзе складаць 40 % ад сярэднямесячных даходаў насельніцтва», — адзначыў намеснік старшыні праўлення і ўдакладніў, што працэнт пазыковай нагрузкі пачне прымяняцца ў Беларусі з 1 мая.**

Акрамя таго, Дзмітрый Лапко ўдакладніў, што банк будзе аналізаваць даходы і выдаткі фізічнай асобы, якая звярнулася па крэдыт. «І выдаткі па крэдытах, мікрапазыках, лізінгу не павінны перавышаць 40 % ад абвешчанага кліентам даходу», — растлумачыў ён. Намеснік старшыні праўлення Нацбанка падкрэсліў, што актыўны рынак рознічнага крэдытавання не можа не прыцягваць увагі рэгулятара. «Лічбы, якія сёння мы назіраем, — 9,3 млрд рублёў спажывецкага крэдытавання, з якіх 6,2 млрд рублёў — іпатэчнае крэдытаванне і 3,1 млрд рублёў — крэдыты на спажывецкія патрэбы. Гэты аднаўленчы рост некалькі бянтэжыць нас», — заявіў ён. Эксперты асцерагаюцца, што банкі могуць пагрэбаваць пэўнымі рызыкамі пры крэдытаванні.

## БАВ павялічваецца амаль на рубель

**Базавая арэндная велічыня (БАВ) з 1 красавіка павялічылася да 16,11 рубля, паведамляе прэс-служба ўрада. Зараз БАВ складае 15,2 рубля.**

Базавая арэндная велічыня прымяняецца ў разліках арэнднай платы пры арэндзе плошчаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці. Гэта датычыцца ўласнасці гаспадарчых таварыстваў, у статутных фондах якіх больш за 50 % акцый (доляй) знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы або яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама капітальных пабудоў, ізаляваных памяшканняў, машына-месцаў, іх частак, уключаючы капітальныя будынкі і іх часткі на рынках і ў гандлёвых цэнтрах.

**Сяргей КУРКАЧ**

# «НА ПАРАДКУ ДНЯ — ЗАРОБКІ ПЕДАГОГАЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У краіне створана рабочая група па распрацоўцы комплексных мерапрыемстваў па ўдасканаленні аплаты прафесарска-выкладчыцкага складу, павышэнні зацікаўленасці ў выніках педагагічнай і навуковай дзейнасці. У цэнтры ўвагі знаходзяцца таксама стыпендыі аспірантаў і дактарантаў, бо ні для кога не сакрэт, што калі выкладчык ВНУ ідзе вучыцца ў дактарантуру, то атрымлівае стыпендыю намнога меншую за яго заробак на выкладчыцкай пасадзе, таму жаданне займацца падрыхтоўкай доктарскай работы адразу знікае.

Сярэднямесячная заработная плата ў адукацыі за студзень — снежань 2017 года склала 557,7 рубля, у тым ліку ў настаўнікаў 673,5 рубля. «Зразумела, што гэта не тыя лічбы, да якіх мы імкнёмся, — заўважыў кіраўнік галіны. — Урадам ставілася мэта давесці заробак у адукацыі да 80 працэнтаў ад сярэдняга заробку ў прамысловасці, і, калі б гэта адбылося, мы павінны былі б выйсці недзе на 800 рублёў. Але мы напрамую залежым ад таго, як спрацуе рэальны сектар эканомікі...»

## Затрымаць маладых спецыялістаў

Летась у сістэму адукацыі было накіравана 5900 выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў, якія атрымалі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. Дзякуючы дадатковым намаганням па падтрымцы маладых педагогаў, прынятым мясцовымі ўладамі, павялічыўся працэнт замацавання маладых спецыялістаў на першым працоўным месцы пасля двух гадоў адпрацоўкі па размеркаванні. Зараз гэты паказчык дасягнуў ужо 73 % (для параўнання: у 2015 годзе ён складаў 66 %).

**«Сёння дырэктар школы нясе персанальную адказнасць за ўсе тыя паперкі, якія прыходзіцца запаўняць яго педагогам».**

Міністр нагадаў, што ў студзені мінулага года ўрад прыняў рашэнне: маладым спецыялістам з катэгорыі педагагічных работнікаў, якія ўжо адпрацавалі па размеркаванні два гады, але працягваюць працаваць у гэтай жа ўстанове адукацыі, яшчэ на год была падоўжана выплата даплаты ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду. Зроблена гэта было для таго, каб не дапусціць зніжэння заробкаў у маладых спецыялістаў і іх адтоку з устаноў адукацыі. Захаванне даплаты яшчэ на адзін год дае магчымасць маладым педагогам прайсці атэстацыю для атрымання другой кваліфікацыйнай катэгорыі.

Між іншым, Ігар Карпенка прапанаваў зноў вярнуцца да Інструкцыі аб атэстацыі педагагічных работнікаў і калі ёсць у гэтым неабходнасць, то яшчэ раз яе пераглядзець. «Можа, нам ёсць сэнс увогуле адмовіцца ад жорсткіх тэрмінаў паміж прысваеннем кваліфікацыйных катэгорый? Калі ў педкалектыве бачаць, што малады педагог паказвае добрыя вынікі, то навошта чакаць устаноўленыя сёння два гады для атэстацыі на другую кваліфікацыйную катэгорыю? Гэта можна зрабіць і раней. Я ўпэўнены, што падобныя пытанні лепш адрэгулююцца непасрэдна на месцах і тут зусім не патрабуецца ўмяшанне вышэйстаячых структур. Мы ж ужо прапісалі, што выпускнікі магістратуры, якія прыходзяць у школу, могуць адразу допускацца да атэстацыі на атрыманне другой кваліфікацыйнай катэгорыі. Таму я гатовы абмяркоўваць з вамі гэта пытанне і далей...»

## «Падводныя камяні» эксперымента

Сёння ў галіне рэалізуецца пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання. Летась у ім удзельнічалі 642 установы агульнай сярэдняй адукацыі і 94 установы дашкольнай адукацыі. Педагагічным работнікам больш як 100 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі ўстанаўлівалася галіновае павышэнне тарыфных ставак, пры гэтым іх сярэдняя заработная плата вырасла на восем працэнтаў.

У 2018 годзе ў эксперыменце ўдзельнічаюць ужо 857 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі і 471 тысяча навучэнцаў. У рамках эксперымента аб'ёмы фінансавання, што накіроўваюцца на навучанне і выхаванне, «прывязваюцца» да колькасці навучэнцаў. Новы механізм прадугледжвае фарміраванне бюджэту ўстановы на падставе сярэднегадавых паказчыкаў колькасці навучэнцаў розных катэгорый (па ступенях навучання, колькасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і колькасці вучняў, якія наведваюць групы падоўжанага дня), нарматыву бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў і карэктуючых каэфіцыентаў. Тэарэтычна школы з высокай напаўняльнасцю павінны знаходзіцца ў выйгрышным становішчы.

— Але ў 2018 годзе ўмовы ўдзелу ў пілотным праекце змяніліся, і для ўстаноў адукацыі, дзе напаўняльнасць перавышае 1250 навучэнцаў, быў устаноўлены каэфіцыент 0,9, — звярнула ўвагу на праблему **старшыня Цэнтральнай раённай арганізацыі г. Гомеля Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Наталля САЗОНАВА.** — У Цэнтральным раёне нашага горада напаўняльнасць устаноў сярэдняй адукацыі вельмі высокая — 173 %, таму чатыры школы, у якіх вучацца амаль сем тысяч дзяцей, працуюць цяпер з прымяненнем гэтага каэфіцыента. Сярод іх ёсць тры ўстановы з эстэтычным кірункам, дзе навучэнцы атрымліваюць паралельна яшчэ і музычную, харэаграфічную і мастацкую адукацыі. І мы ўжо бачым, што 78 педработнікаў могуць апынуцца на вуліцы, калі не будзе грошай на эстэтычны напрамак.

Між іншым, з 3205 работнікаў устаноў адукацыі Цэнтральнага раёна Гомеля даплаты да мінімальнай заработнай платы атрымлівае практычна трэцяя частка — 958 чалавек. Прычым не толькі тэхнічны персанал, але і маладыя спецыялісты — інжынеры ЭВМ, праграмісты, бухгалтары, эканамісты, якіх накіроўваюць у цэнтралізаваную бухгалтэрыю па размеркаванні.

— Незалежна ад якасці працы, прыкладзеных намаганняў і праяўленай ініцыятывы ўсе яны атрымліваюць аднолькавы заробак. І наймальнік ніяк ні на якасць іх працы, ні на яе вынікі паўплываць не можа, — звярнула ўвагу міністра на праблему Наталля Сазонава.

— Для нас вельмі важна падтрымаць малакамплектныя сельскія школы, таму там і ўстанаўліваецца павышальны каэфіцыент. Незалежна ад таго, колькі вучняў сядзіць за партай, мы павінны ўтрымліваць і ацяпляць увесь будынак, падвозіць дзяцей да школ, выплачваць заробак педагогам і тэхперсаналу і гэтак далей. Таму і нарматыў на ўтрыманне аднаго вучня ў сельскай школе больш чым удвая перавышае аналагічны нарматыў для гарадоў. Ну не могуць быць аднолькавыя ўмовы для гарадскіх і сельскіх школ, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Ігар Карпенка. — Першыя мае паездкі ў статусе міністра былі менавіта па малакамплектных школах. І я быў вымушаны падрыхтаваць загад, які забараняе тэрытарыяльным органам кіравання адукацыяй закрываць ці аптымізаваць установы адукацыі без узгаднення з міністрам адукацыі. Трэба вельмі граматна падыходзіць да такіх пытанняў: аналізаваць, якім будзе кіламетраж падвозу выхаванцаў, колькі грошай на гэта спатрэбіцца, ці будуць працаўладкаваныя педагогі з закрытых школ.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## Бюракратыя — пад адказнасць кіраўнікоў

«Галіной будзе кіраваць міністр, незалежна ад таго, хто з'яўляецца наймальнікам у начальніка ўпраўлення адукацыі і ў дырэктара школы, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — І хачу папярэдзіць, што час дывановых дарожак прайшоў. Я буду прыязджаць, не папярэджваючы пра свой візіт, і ісці туды, дзе мяне не чакаюць. І не з параднага, а з чорнага ўвахода. Сёння дырэктар школы нясе персанальную адказнасць за ўсе тыя паперкі, якія прыходзіцца запаўняць яго педагогам. Міністэрства адукацыі ўстанавіла пералік абавязковай дакументацыі, а ўсё, што ў яго не трапляе, — гэта вашы выдумкі на месцах. Вось і апраўдвайцеся перад настаўнікамі самі».

**«Толькі на месцах ведаюць усю спецыфіку, і менавіта з яе ўлікам трэба ўстанаўліваць пачатак заняткаў. Ёсць рэкамендацыі, але павінен быць і здаровы сэнс!»**

